

**Ці быць храму?**



**Правяраем печы і апавяшчальнікі**



**Даўгалецце са знакам якасці**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 212 (28322)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Эканамічныя адносіны — на ўзровень асабістых і палітычных

**Дзверы Беларусі заўсёды адчынены для Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і эмірата Дубай. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам і міністрам абароны ААЭ, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашыдам аль-Мактумам, паведамляе БЕЛТА.**

«Дзякуй вам за добрыя словы, якія вы адрасавалі мне і майму народу. У сваю чаргу хачу сказаць, што дзверы Беларусі для ААЭ і эмірата Дубай заўсёды адчынены. І я хацеў бы выкласці галоўную сваю пазіцыю на нашай сустрэчы, каб вы часцей бывалі ў Беларусі. У гэтым наш вялікі інтарэс. Нам трэба выводзіць нашы эканамічныя адносіны на ўзровень асабістых і палітычных», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу шэйх Мухамед бен Рашыд аль-Мактум адзначыў, што вельмі рады візіту Аляксандра Лукашэнкі. Ён таксама заявіў аб гатоўнасці ААЭ ў цэлым і эмірата Дубай у прыватнасці да далейшага развіцця адносін з Беларуссю. «Мы хочам развіваць гэтыя адносіны да лепшага», — сказаў ён.

Шэйх Мухамед бен Рашыд аль-Мактум таксама цёпла адазваўся пра Беларусь і яе людзей.

Як паведамляла «Звязда», напярэдадні ў сталіцы ААЭ адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Бакі абмеркавалі перспектыўныя напрамкі далейшага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін у розных галінах, у тым ліку гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне. Адной з тэм перагавораў стала сумесная работа і абмен вопытам у сферы высокіх тэхналогій і ўстойлівага развіцця. На перагаворах таксама былі падрабязна абмеркаваны і пытанні міжнароднага парадку дня.

# ДУХМЯНАЯ МАЙСТЭРНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сям'і мінчанкі Валянціны МАРЧАНКІ ёсць свой пчальнік. Самой Валянціне даспадобы працаваць з пчоламі — даглядаць пчаліныя домікі, ставіць рамкі, качаць мёд. Аднойчы гэты занятак падказаў жанчыне кірунак у выяўленні творчай натуры — з гарачага воску Валянціна робіць скульптурныя свечкі, заліваючы яго ў формы са звычайнага чайніка. Свае духмяныя вырабы майстрыха прадае ў невялікай майстэрні-крамцы, якая знаходзіцца ў сядзібна-паркавым турысцкім комплексе «Дукорскі маёнтак» Пухавіцкага раёна.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі:**

*«Не толькі ваенна-палітычная, але і фінансава-эканамічная сітуацыя ў свеце дынамічна развіваецца. На мой асабісты погляд, праблема аператыўнага адэкватнага рэагавання на зменлівыя абставіны — гэта праблема нумар адзін для нашых галін і шэрагу прадпрыемстваў. На жаль, часам даводзіцца проста штурхаць некаторыя нашы прадпрыемствы, прымушаць адгукнуцца на нейкія прапановы знешніх партнёраў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9040 | ▼ |
| Еўра | 2,0901 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0744 | ▼ |

## ЗАСЛУЖАНАЕ ПРЫЗНАННЕ — ПРАФЕСІЯНАЛАМ

**Учора прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ уручыў дзяржаўныя ўзнагароды 94 заслужаным грамадзянам.**

Падзяку Прэзідэнта за падрыхтоўку пятага Усебеларускага народнага сходу атрымалі **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА** *(на фота)*, **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.**



Фота БЕЛТА.

Сярод узнагароджаных таксама — значная частка медыцынскіх работнікаў. Кіраўнік урада адзначыў, што ўпершыню за апошнія 20 гадоў у Беларусі нараджальнасць перавысіла смяротнасць. Па яго словах, гэта стала магчымым дзякуючы комплексным паслядоўным мерам дзяржаўнай палітыкі. «Натуральны прырост толькі за 9 месяцаў гэтага года назіраецца адразу ў 85 са 113 гарадоў, а таксама ў кожным трэцім пасёлку гарадскога тыпу. За гэтыя ж 9 месяцаў у краіне нарадзілася амаль 90 тысяч маленькіх беларусаў. Гэта на паўтысячы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Прычым большасць з іх — гэта ўжо другое і наступныя дзеці», — адзначыў ён. Андрэй Кабякоў нагадаў, што 1 лістапада выраслі дапамогі, якія выплачваюцца бацькам, што знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў.

СТАР. 2

## ВІЦЕБСК НАБУДЗЕ НОВЫЯ РЫСЫ

**Перспектывы забудовы гарадской прасторы**

**Да чарговага міжнароднага фэсту «Славянскі базар» плошча Свабоды стане пешаходнай. У абласным цэнтры сярод іншых з'явіцца новы «спальны» мікраран «Чаромушкі». Але, бадай, самая сенсацыйная навіна — рэальная перспектыва аднаўлення касцёла XVIII стагоддзя. Яго можна будзе ўбачыць насупраць ратушы — сімвала Віцебска.**



belarus-travel.livejournal.com

### Горад «расцягнуўся» на трэць

Тэрыторыя горада над Дзвіной па ініцыятыве былога губернатара, цяперашняга кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Косінца павялічылася на трэць. Зразумела, на новых плошчах вялікі фронт работ для праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. А раней прыходзілася «лавіраваць». Напрыклад, каб не закрануць землі сельскагаспадарчага прызначэння.

— У 2011-м годзе адбылася знакавая падзея. Уявіце сабе: да гэтага ў гарадскіх межах было каля 9 тысяч гектараў. А далучылі больш за тры тысячы. Вельмі вялікая тэрыторыя: трэць ад таго, што было ў Віцебску, якому больш за 1000 гадоў, — расказвае **намеснік начальніка аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебскага гарвыканкама Леанід БАГДАНАЎ.**

Мінулы генеральны план горада быў зацверджаны ў 2003-м годзе. А да гэтага новага генплана не было 20 гадоў! Згодна з цяперашнімі патрабаваннямі, «пашпарты гарадоў» афармляюцца на пяцігодкі і зацвярджаюцца на ўзроўні кіраўніцтва краіны. Такім чынам, цяпер можна ўявіць, як зменіцца Віцебск да 2020 года. Калі на рэалізацыю задуманага хопіць фінансавання.

СТАР. 5

■ На слыху

## Не пакараць, а папярэдзіць

### Новы падатак прымусіў многіх «шэрых» работнікаў выйсці з ценю

**Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) накіравала каля 50 тысяч паведамленняў на аплату спецыяльнага збору тым, хто летась не ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржаўных расходаў, паведаміла намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА.**
**Памер збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год складае 360 рублёў (3,6 млн — «старымі»).**

### Стымул спрацаваў

Тут трэба нагадаць, што, калі яшчэ дакумент аб сацыяльным утрыманстве быў на стадыі ідэі, чыноўнікі паведамлялі: тых, хто не працуе і не плаціць падаткі, больш за 400 тысяч. А на справе іх аказалася ў разы менш. Чаму?

Спадарыня Шаўчэнка на падобную нестыкоўку ў лічбах адказала, што асноўнай мэтай. Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» было стымуляванне працаздольнага насельніцтва да працы і папярэджанне такога ўтрыманства як масавай з'явы. Невялікая колькасць накіраваных паведамленняў (гэта неканчатковая лічба) сведчыць аб тым, што часткова галоўная мэта ўжо дасягнута. Напрыклад, летась, пасля прыняцця дэкрэта, у 1,5 раза ўзрасла колькасць асоб, якія сталі на ўлік у якасці беспрацоўных. Таксама ўзрасла колькасць асоб, якія займаюцца дзейнасцю па заяўным прынцыпе, што не патрабуе рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП). Потым павялічылася колькасць занятых у сферы аграэкатурызму і рамеснікаў. Акрамя таго, у ІП на 22% вырасла колькасць наёмных асоб. «Мы бачым, што стымуляванне актыўнасці працаздольнага насельніцтва адбылося», — падкрэсліла намеснік міністра.

СТАР. 2

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Ці будзе Украіна выбачацца?




**Гісторыя з самалётам «Белавія», якога 21 кастрычніка пасля вылету з кіеўскага аэрапорта «Жуляны» пад пагрозай падняць знішчальнікі прымусілі вярнуцца назад, атрымала свой працяг. Учора была абнародавана расшыфроўка перамоў пілота беларускага самалёта і кіеўскага дыспетчара. Пацвярджаецца ўся тая інфармацыя, якая была распаўсюджана раней: сапраўды, была прамая пагроза, сапраўды, беларускі экіпаж, усведамляючы адказнасць за жыцці пасажыраў (а іх было 136 чалавек) падпарадкаваўся загаду і пасадзіў самалёт.**

Расшыфроўка паказвае, што распараджэнне дыспетчара вярнуць самалёт паступіла вельмі нечакана і пачалося з пагрозы.

**Дыспетчар:**
*— Белавія-840, Кіеў-Радар.*
**Пілот:**
*— Слухаю.*
**Дыспетчар:**
*— Белавія-840, паступіла ўказанне: вам трэба неабходна вярнуцца на аэрадром вылету «Жуляны». ЗА НЕВЫКАНАННЕ БУДЗЕ ПАДНЯТА БАЯВАЯ АВІЯЦЫЯ НА ПЕРАХВАТ.*

Экіпаж пасадзіў самалёт паспяхова, у салон зайшлі прадстаўнікі Службы бяспекі Украіны і назвалі прозвішча аднаго з пасажыраў, якога забралі з сабой. Самалёт паляцеў у Мінск, затрыманы пасажыр — таксама, толькі наступным рэйсам. І... усё.

На наступны дзень, **22 кастрычніка**, у Міністэрства замежных спраў нашай краіны выклікалі Часовага паверанага ў справах Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Валерыя Джыгуна і ўручылі яму ноту. Беларускі бок заявіў пратэст «у сувязі з дзеяннямі кампетэнтных органаў Украіны па прымусовым вяртанні беларускага паветранага судна авіякампаніі «Белавія», якое ажыццяўляла 21 кастрычніка 2016 года рэгулярны рэйс B2 840 па маршруце «Кіеў-Мінск». У ноце МЗС падкрэслена, што беларускі бок чакае афіцыйных выбачэнняў і патрабуе кампенсацыі ўсіх фінансавых выдаткаў, выкліканых дзеяннямі ўкраінскага боку.

Міністэрства замежных спраў таксама даручыла Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь ва Украіне Ігару Сокалу ўручыць аналагічную ноту пратэсту ва ўкраінскім МЗС.

Але адказу не было.

**27 кастрычніка** на чарговым брыфінгу для прадстаўнікоў СМІ **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў** нашай дзяржавы, паведаміў, што рэакцыя ўкраінскага боку на ноту адсутнічае. «Калі яе не будзе і далей, то мы будзем вымушаныя распачаць дадатковыя крокі, аж да апублікавання расшыфроўкі перамоў членаў экіпажа з украінскім дыспетчарам», — заявіў Дзмітрый Міронччык.

І вось **1 лістапада** расшыфроўка апублікавана. Што далей? Карэспандэнт «Звязды» з гэтай нагоды ўчора патэлефанавала ў прэс-службу Міністэрства замежных спраў Украіны. «Украінскі бок з усёй сур'ёзнасцю паставіўся да інцыдэнту. У цяперашні момант працягваецца расследаванне», — паведамілі там.

**Дэпутат Дзмітрый ШАЎЦОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах**, выказаў нашай газеце сваё меркаванне наконт «інцыдэнту»:

— У гэтай сітуацыі нашы пілоты зрабілі выключна правільна. Ні ў якім разе нельга ставіць пад пагрозу жыццё іншых грамадзян, якія знаходзяцца ў самалёце. Тое ўказанне, якое перадаў дыспетчар, экіпаж нашага самалёта трактаваў дакладна. Іншае пытанне, які пасыл. Гэта вельмі абуральны крок, калі пад пагрозай узлёта баявых самалётаў разварочваецца пасажырскі самалёт. Пакуль, на жаль, афіцыйных тлумачэнняў, выбачэнняў ад украінскага боку мы не пачулі. Але, думаю, гэты канфлікт у любым выпадку будзе вырашаны. І ў далейшым мы даведаемся аб'ектыўную прычыну ўсяго, што адбылося.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

ISSN 1990 - 763X

16212>

9 771990 763008

## КОРАТКА

У Беларусі з 1 лістапада ўстаноўлены памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў. МСБ на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек з 1.11.16 па 31.01.17 г. у разліку на месяц складае BIN293,32 (раней — BIN285,43). Новы МСБ павысіўся на 2,8% да папярэдняга.

**У Ханоі з'явяцца зборачныя вытворчасці пасажырскай і грузавой тэхнікі МАЗ з гадавой вытворчай магутнасцю 1,5 тыс. адзінак.**

Міністэрства фінансаў з 1 лістапада паніжае цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупляюцца ў фізічных асоб (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб).

**МУС унесла ў Савет Міністраў праект указа па абмежаванні продажу алкаголю.**

Беларускі футбольны турнір «Надзея» прызнаны Еўрапейскім саюзам футбольных асацыяцый (УЕФА) лепшым сацыяльным праектам па выніках сезона 2015/2016.

■ Набалелае

## СЁННЯ ЁН ЯЕ ПАБІЎ, А ЗАЎТРА НЕ РАЗЛІЧЫЎ СІЛЫ...

### Як вырашыць праблему сямейна-бытавога насілля

**По статыстыцы, да 30% зарэгістраваных забойстваў адбываецца ў сям'і, пры паўсядзённых абставінах. Гэта не паддаецца звычайнай логіцы, бо людзі гінуць ад рук сваіх самых блізкіх, тых, з кім, здавалася б, лёс звязаў узаемным каханнем, любоўю, адданасцю і падтрымкай. Як правіла, да трагедыі прыводзіць канфлікт, які цягнецца гадамі. Часта пра штодзённыя скандалы, высвятленне адносін з дапамогай грубай фізічнай сілы ў канкрэтнай сям'і ведаюць і калегі, і сваякі, і суседзі, і работнікі праваахоўных органаў, але не ўмешваюцца.**
**Такой пазіцыі можна знайсці тлумачэнне: у адносінах паміж мужам і жонкай, старымі бацькамі і дарослымі дзецьмі чужому чалавеку цяжка разабрацца. Прычыны сварак хаваюцца ў сутыкненні інтарэсаў, розных поглядах на мараль, у розным бачанні свету і жыццёвым вопыце. Нярэдка**



**каталізатарам трагедыі выступае алкаголь.**
**У сямейных катастрофах часта мае месца правакацыя, і самая распаўсюджаная ахвяра тут — жонка. Сямейныя і бытавыя злачынствы не маюць ні нацыянальнасці, ні ўзросту.**

СТАР. 2